# ПАЛІТАЛОГІЯ

УДК 32.001(470+476)

***Ю. П. Бондар***

## ПАЛІТЫЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ Ў БЕЛАРУСІ І РАСІІ: ПАРАЎНАЛЬНЫ АНАЛІЗ ПРЫЯРЫТЭТНЫХ НАПРАМКАЎ

Палітычныя веды, якія вытрымалі праверку агульначалавечай практыкай, былі запатрабаваны ў Расіі і Беларусі толькі ў 90-я гг. XX ст. Паліталогія набыла статус аўтаномнай навуковай і вучэбнай дысцыпліны ў сістэме сацыяльна-гуманітарных навук.

Грамадскае прызнанне значнасці паліталогіі ў радыкальных пераўтварэннях пасля распаду СССР паставіла ў парадак дня комплекс першачарговых задач:

- стварэнне навуковай інфраструктуры;
- фарміраванне прафесійна-сталай карпарацыі айчынных палітолагаў;
- асваенне дасягненняў сусветнай палітычнай навукі і практыкі;
- авалоданне сучаснай метадалогіяй аналізу з'яў і працэсаў палітычнай рэальнасці;
- выпрацоўка і легітымацыя стандартаў (крытэрыяў, норм) навукова-даследчай і педагагічнай дзейнасці;
- вызначэнне і ажыццяўленне прыярытэтных напрамкаў даследаванняў, якія адпавядаюць патрэбнасцям пераходных грамадстваў і запатрабаванням часу.

Нягледзячы на сваю маладосць, айчынная паліталогія паступова рэалізуе гэтыя задачы: павялічвае свой патэнцыял і пастурова ўключаецца ў распрацоўку прыярытэтных праблем палітычнай навукі пераходных грамадстваў. Таму лічым мэтазгодным прааналізаваць поспехі і недахопы палітычных даследаванняў, выявіць іх прыярытэтныя кірункі і сацыяльную карыснасць, атрымаць урокі ў інтарэсах паспяховага завяршэння працэсу інстытуцыялізацыі паліталогіі на постсавецкай прасторы.

У фондзе нашай паліталагічнай супольнасці некалькі тысяч манаграфій, змястоўных артыкулаў, зборнікаў дакладаў па розных праблемах навукі і грамадскіх пераўтварэнняў. Яны ўтрымліваюць багаты эмпірычны матэрыял, які заслугоўвае ўсебаковага аналітычнага асэнсавання і аб'ектыўнай ацэнкі. Мэта нашага артыкула — выявіць прыярытэтныя даследаванні навукоўцаў Беларусі і Расіі і даць іх параўнальны аналіз.

Адсутнасць універсальных мадэлей сацыяльнай мадэрнізацыі абумовіла ўсплёск увагі навукоўцаў да палітычнай тэорыі як сістэмы абагульненых (ідэальных, адносна абстрактных, фундаментальных, метадалагічных) ведаў. З аднаго боку, яны пераасэнсоўваюць дасягненні палітычнай тэорыі праз прызму агульначалавечай практыкі, праблем свету, якія глабалізуецца. З другога — адклікаюцца на запатрабаванні пераходных грамадстваў. Зацікаўлена абмяркоўваюцца дыскусійныя тэмы з мэтай фарміравання абноўленых, сістэмных тэарэтычных уяўленняў аб змененай палітычнай рэальнасці [1].

Навукоўцы Беларусі і Расіі імкнуцца канкрэтызаваць, узбагаціць палітычную тэорыю новымі поглядамі, ідэямі, вывадамі, светапоглядным бачаннем спецыфікі працэсаў і тэндэнцый развіцця пераходных грамадстваў. Аб гэтым сведчаць публікацыі, што адлюстроўваюць прыярытэтныя напрамкі навукова-тэарэтычнага аналізу. Іх аўтары даследуюць розныя аспекты жыцця постсацыялістычных дзяржаў: спецыфіку палітыкі і ўлады; праблемы ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця; крыніцы і шляхі вырашэння канфліктаў і крызісаў; структурна-функцыянальныя змены ў палітычнай сістэме; механізмы і эфектыўнасць палітычнага кіравання; нацыянальную дзяржаўнасць і яе інтарэсы; палітычную культуру і ідэалогію; палітычнае лідэрства; інстытуты фарміруемага грамадзянскага грамадства; геапалітычныя змены і знешнюю палітыку краін СНД; палітычныя традыцыі і каштоўнасці.

Прыярытэтным напрамкам пошукаў навукоўцаў Беларусі з'яўляецца нацыянальная дзяржаўнасць. Гэтаму прысвечаны працы В. А. Круталевіча, М. Ф. Піліпенкі, У. Ф. Ладысева, П. І. Брыгадзіна, У. А. Мельніка, Ю. Л. Казакова, М. У. Сільчанкі, І. А. Басюка, І. А. Юхо, А. Р. Слукі, М. С. Сташкевіча, Л. Ф. Заікі, П. Р. Чыгрынава і інш. Аналізуюцца гістарычныя ўмовы і тэндэнцыі станаўлення беларускай дзяржаўнасці, уплыў на нацыянальную ідэнтыфікацыю Кіеўскай Русі, Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, СССР. Высвятляюцца інтарэсы, стратэгічныя задачы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і праблемы дзяржаўнасці, духоўна-каштоўнасная сутнасць нацыянальнай ідэі, альтэрнатывы палітычнага развіцця.

У рамках гэтага напрамку даследуюцца тэндэнцыі і перспектывы сцвярджэння ў Беларусі прававой дзяржавы і цывільнага грамадства (А. І. Манаеў, А. М. Дзенісенка, Н. В. Паўлава, В. Г. Ціхіня, В. І. Шабайлаў), праў і свабод чалавека (Н. М. Беляковіч, І. І. Катляр), роля ў структуры дэмакратыі палітычных партый (А. М. Бадулін, Е. У. Баранава, У. А. Бабкоў, І. В. Катляроў, М. В. Кузняцоў).

Праблемы палітычнага аналізу пераходных працэсаў, распрацоўкі і ажыццяўлення дзяржаўнай палітыкі ва ўмовах рэфармавання грамадства даследуюць С. В. Рашэтнікаў, Н. А. Антановіч, Л. Я. Землякоў, П. І. Бондар, В. В. Бушчык, А. М. Байчораў, Я. В. Матусевіч, У. А. Мельнік, В. В. Шынкароў.

Некаторыя аспекты трансфармацыі беларускага грамадства даследуюцца ў працах А. М. Данілава, С. Р. Парэчынай, А. М. Абрамовіча, У. П. Вялічкі, Л. Я. Крыштаповіча, У. П. Вераб'ёва, В. В. Бушчыка, У. А. Бажанава, Н. П. Дзянісюк, Л. Ф. Яўменава, У. І. Карбалевіча, А. В. Матусевіча, П. Р. Нікіценкі, А. А. Сакалоўскага і інш.

Даследаванню пераходнага грамадства як прыярытэтнай праблемы навукі прысвечана манаграфія А. М. Данілава, выдадзеная ў 1997 г. [2]. На прыкладзе перамен у краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, выкарыстоўваючы ацэнкі і прагнозы заходніх вучоных, аўтар разважае аб змесце працэсу трансфармацыі ў сферах палітычнай, сацыяльна-эканамічнай, культурнай, рэгіянальнай інтэграцыі (СНД). Яго вывады сведчаць аб тым, што вывучэнне пераходных працэсаў з'яўляецца комплекснай задачай, паколькі ў ёй вылучаюцца і тэарэтычны, і метадалагічны, каштоўнасна-светапоглядны і прыкладны аспекты. З-за недахопу эмпірычнага матэрыялу аб зменах на постсацыялістычнай прасторы да часу выдання кнігі аўтару не ўдалося сістэмна вырашыць гэту задачу. Разам з тым яму ўдалося, на наш погляд, звярнуць увагу даследчыкаў на актуальную навуковую праблему, неабходнасць сацыялагічнага і палітычнага аналізу тэндэнцый, заканамернасцей і супярэчнасцей трансфармацыі пераходных грамадстваў.

Змены ў канстытуцыйным развіцці Беларусі асвятляюцца ў публікацыях Р. А. Васілевіча [3]. У іх дадзены аналіз структуры, парадку фарміравання, прававога статусу, паўнамоцтваў, механізмаў узаемадзеяння інстытутаў улады, прапануюцца шляхі ўдасканалення нарматыўных актаў у пераходны перыяд. Карысная для навукоўцаў эмпірычная інфармацыя аб палітычным жыцці краіны, рэйтынгу лідэраў, грамадскіх праблемах і запатрабаваннях утрымліваецца ў зборніках матэрыялаў і артыкулаў, якія выдаюцца Інстытутам сацыяльна-палітычных даследаванняў пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь [4], дакладах на міжнародных навукова-практычных канферэнцыях і рэспубліканскіх нарадах па пытаннях дзяржаўнага кіравання [5].

Аналіз усёй сукупнасці прац дазваляе зрабіць ключавы вывад. Сутнасць яго ў тым, што мадэрнізацыя ў Беларусі як напрамак даследаванняў застаецца «нязведанай галіной» пазнавання. Няма ні адной індывідуальнай або калектыўнай манаграфіі, прысвечанай палітычнаму аналізу пераходнага беларускага грамадства на дакладным эмпірычным матэрыяле якасных перамен і негатыўных з'яў у эканамічным, сацыяльным, палітычным, духоўным жыцці, якія адбываюцца ў ім, праблем і «хвароб», перспектыў развіцця. Публікуемыя артыкулы і даклады палітыкаў і навукоўцаў у афіцыйных, апазіцыйных і незалежных перыядычных выданнях адлюстроўваюць пераважна пазітыўныя або дыяметральна процілеглыя ім факты практычнай палітыкі дзяржаўных інстытутаў, маюць на ўвазе агітацыйна-прапагандысцкія мэты і па сваім узроўні не могуць быць аднесены да катэгорыі навуковых даследаванняў.

Няма абагульняючых прац, якія б характарызаваліся тэарэтыка-метадалагічнай абгрунтаванасцю, скрупулёзнасцю, крытычна-творчым, сапраўды незалежным поглядам на стратэгію і тактыку рэформ, дзейнасць і эфектыўнасць сацыяльных інстытутаў, рэальны стан палітычнай культуры і дэмакратызацыі палітыка-ўладных адносін у грамадстве.

Нацыянальная дзяржаўнасць, тэндэнцыі развіцця рэфармуемага грамадства даследуюцца таксама і навукоўцамі Расіі. У краіне выдадзена значна больш, чым у Беларусі, навуковых прац, якім уласцівыя шматпланавасць праблематыкі і тэарэтыка-метадалагічныя падыходы да ацэнкі практычнай палітыкі. Іх характэрныя асаблівасці — у незалежнасці навуковага пошуку, крытычна-творчай інтэрпрэтацыі перамен у расійскім грамадстве, узрастаючай цікавасці да метадалогіі пазнавання і тэхналогій палітычных адносін і працэсаў.

Пытанні, якія вывучаюцца, размяркоўваюцца па наступных напрамках:

- характар і вынікі лібералізацыі, перабудовы палітычнай сістэмы;
- палітычны выбар грамадства і праблемы ўмацавання дзяржаўнасці;
- крызісныя з'явы і перспектывы кансалідацыі дэмакратыі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- стратэгія і тактыка сацыяльных рэформ, знешнепалітычнай дзейнасці і геапалітычныя інтарэсы Расіі;
- канстытуцыяналізм;
- федэралізм як форма дзяржаўнага ўпарадкавання;
- прафесіяналізм і аўтарытэт палітычнай эліты, яе ўплыў на сацыяльныя перамены;
- палітычная рэгіяналістыка.

Шмат прац, прысвечаных трансфармацыі палітычнай сістэмы. Іх аўтары даследуюць актуальныя бакі быцця:

- перамены ў легітымнасці, структуры, функцыях, культуры паводзін дзяржаўных інстытутаў;
- палітычныя мэты і каштоўнасці грамадства, рацыянальнасць яго палітычнага выбару;
- ступень адаптыўнасці і стабільнасці палітычнай сістэмы, яе эфектыўнасць на «ўваходзе» і «выхадзе»;
- характар сацыяльных рэформ, негатыўныя фактары перамен;
- тэндэнцыі электаральных паводзін;
- тэхналогіі ўплыву на масавую свядомасць;
- адпаведнасць нацыянальным умовам класічнай дэмакратыі, транзіталагічных парадыгмаў.

Адносна аўтаномную групу складаюць працы, аўтары якіх тэарэтычна асэнсоўваюць і тлумачаць прынцыпы і шляхі фарміравання ў Расіі прававой дзяржавы і цывільнага грамадства. Гэтыя працы маюць тыя ж недахопы, якія мы выявілі ў публікацыях па аналагічных праблемах у Беларусі.

Больш актыўна і прадметна даследуюцца ў Расіі, чым у Беларусі, палітычныя працэсы ў пераходным грамадстве. Як правіла, навукоўцы абапіраюцца на сацыялагічныя даныя, крытычна ацэньваюць і прагназіруюць палітычныя адносіны. Палітра іх інтарэсаў уражвае маштабнасцю і разнастайнасцю праблематыкі: практычная палітыка і яе ўплыў на сітуацыю ў краіне; вынікі выбараў і перамены ў паводзінах выбаршчыкаў; палітычная стратыфікацыя і канкурэнтнае проціборства суб'ектаў палітыкі; матывы ўдзелу грамадзян у палітычных акцыях; прычыны міжнацыянальных супярэчнасцей і сацыяльных канфліктаў; крызісныя з'явы ў сацыяльна-эканамічнай і духоўна-ідэалагічнай сферах; дылемы і дэфармацыі ў грамадстве; СМІ як інструмент камунікацыі; шляхі дасягнення згоды і кансалідацыі ўдзельнікаў палітычнага працэсу; псіхалагічныя механізмы ўспрымання палітычных рэалій і інш.

Мэтанакіравана распрацоўваюцца расійскімі навукоўцамі (і гэта іх адрознівае ад беларускіх калег) тэхналагічныя аспекты палітычнай дзейнасці: метады аналізу і прагназіравання палітычнай сітуацыі; інфармацыйна-аналітычныя тэхналогіі; кагнітыўныя мадэлі пераканаўчай камунікацыі; тэхналогіі палітычных (выбарчых) кампаній; палітычны менеджмент; палітычная рэклама; тэхналогіі сувязей з грамадскасцю, вырашэння канфліктаў, выкарыстання адміністрацыйнага рэсурсу, маніпуліравання і папулізму; тэхналогіі палітычнага кансультавання і камунікацыі.

Аб'ектам тэарэтычнага аналізу паліталагаў, разам з гісторыкамі, сацыёлагамі і іншымі грамадазнаўцамі, з'яўляюцца практыка дзяржаўнага кіравання, сацыяльна-эканамічная палітыка ўрада. Вывучаючы яе, навукоўцы Расіі і Беларусі неадназначна, з рознай ступенню крытычнасці ацэньваюць стыль, характар і эфектыўнасць кіравання пераходным грамадствам, выказваюць альтэрнатыўныя погляды на «край мяжы» дзяржаўнага рэгулявання, прафесійныя і маральныя якасці кіруючай эліты.

Расійскія даследчыкі звяртаюць пільную ўвагу на праблемы і супярэчнасці трансфармацыі, аўтарытарныя тэндэнцыі ў сацыяльным кіраванні, вытокі, маштабнасць распаўсюджвання і негатыўныя вынікі карупцыі, бюракратызму, духоўна-маральнай дэградацыі — з'яў, не сумяшчальных з дэмакратычнымі каштоўнасцямі.

Публікацыі беларускіх інтэлектуалаў у дзяржаўных выданнях, як правіла, не адзначаюцца крытычна-аналітычным «напалам», іх аналіз абмяжоўваецца пазітыўнай ацэнкай сацыяльных змен, палітычнай сітуацыі ў краіне, палітыкі і светапогляду кіруючай эліты, яе паводзін і ўзаемаадносін з палітычнымі канкурэнтамі. І, наадварот, апазіцыйныя і незалежныя выданні адназначна адлюстроўваюць палітычныя працэсы ў краіне і дзеянні ўлады ў негатыўным, «змрочным» святле.

Выклікаюць цікавасць грамадскасці публікацыі аб палітычнай культуры і ідэалогіі, якія з'явіліся ў апошнія гады. Яны абумоўлены патрэбамі мадэрнізацыі, крызісам «ідэнтычнасці», негатыўнымі тэндэнцыямі ў духоўна-ідэалагічнай сферы і неабходнасцю іх пераадолення. Падрабязны аналіз іх зместу і метадалогіі на эмпірычным матэрыяле Беларусі і Расіі ўжо дадзены аўтарам у дзвюх публікацыях [6]. Тут жа падкрэслім, што колькасць і праблематыка апублікаваных прац пераконваюць у інтэнсіўнай «крышталізацыі» гэтага напрамку паліталагічных даследаванняў.

Пераходнаму грамадству ўласціва спецыфічная палітычная культура. Яна заканамерна спалучае ў сабе элементы дэмакратычнай (грамадзянскай, паводле класіфікацыі Г. Алмонда), патрыярхальнай і падданніцкай культур і адмоўна адбіваецца на тэмпах і якасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мадэрнізацыі палітычнай сістэмы. Даследчыкі Беларусі і Расіі выявілі неаднароднасць, фрагментарнасць палітычнай культуры. Яе змест складаюць і каштоўнасныя ўстаноўкі савецкай эпохі з яе аўтарытарнымі імператывамі, і няпэўныя ўяўленні аб пераходным перыядзе быцця, і асаблівасці нацыянальнага менталітэту, культурна-гістарычныя традыцыі далёкага мінулага. Праведзеныя даследаванні даюць аб'ёмную эмірычную інфармацыю для тлумачэння крызісу «ідэнтычнасці» пераходнага перыяду, вызначэння аптымальнай мадэлі палітычнай сацыялізацыі, стымулявання палітычнага ўдзелу, творчага пошуку дэмакратычнай дзяржаўнай ідэалогіі. Такая ідэалогія сёння — жыццёвая патрэбнасць. Яна павінна ўзброіць грамадства дэмакратычнымі каштоўнаснымі арыентацыямі ў адносінах да палітычнай сістэмы (ідэямі, меркаваннямі, думкамі, матывамі паводзін), кансалідаваць грамадзян, стымуляваць сацыяльную эфектыўнасць дзяржаўных і грамадзянскіх інстытутаў.

Дзейнасць постсавецкіх дзяржаў на міжнароднай арэне запатрабавала кардынальнага пераасэнсавання іх знешняй палітыкі, стратэгіі і тактыкі ва ўмовах глабалізацыі адносін у свеце. Расійскія вучоныя актыўна даследуюць патэнцыял, прыярытэтныя кірункі і праблемы знешняй палітыкі сваіх краін, іх нацыянальныя інтарэсы і ступень рэалізацыі стратэгічных мэт, метады і формы, эфектыўнасць і перспектывы супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі, фактары нацыянальнай бяспекі, пытанні інтэграцыі СНД і ЕС, устанаўлення новага парадку ў свеце.

Варта адзначыць, што і па колькасці, і па якасці публікацыі расійскіх даследчыкаў прыкметна адрозніваюцца ад беларускіх. Яны падрыхтаваны аўтарытэтнымі спецыялістамі ў галіне міжнародных адносін, асвятляюць шырокі спектр пытанняў нацыянальнай бяспекі, сусветнага палітычнага развіцця ў XXI в., геапалітычнай стратэгіі Расіі, міжнароднага супрацоўніцтва. Характэрная рыса большасці манаграфій і артыкулаў — высокая інфарматыўнасць і грунтоўнасць палітычнага аналізу тэндэнцый і праблем сусветнай палітыкі, ролі ў ёй Расіі як буйной еўразійскай дзяржавы. Сёння беларуская гістарыяграфія не мае абагульняючых, фундаментальных даследаванняў у сферах знешняй палітыкі краіны ў пераходны перыяд, геапалітычных змен у сучасным свеце.

Метадалогія палітычнага аналізу праблем пераходнага грамадства патрабуе спецыяльных публікацый. Тут мы зноў канстатуем, што метадалагічныя пытанні больш паслядоўна, хаця і не заўсёды паспяхова, распрацоўваюцца расійскімі вучонымі. Публікацый беларускіх даследчыкаў па дадзеным пытанні значна менш, і яны не адрозніваюцца тэматычнай разнастайнасцю.

Дынамічна развіваецца ў Расіі (у Беларусі гэтая тэндэнцыя пакуль што не выяўляецца) такая галіна палітычнай навукі, як параўнальная паліталогія [7]. Цікавасць да яе даследчыкаў узрастае. Вызначыўся прадмет дысцыпліны: палітычныя падзеі і працэсы ў розных краінах і рэгіёнах свету, выяўленне іх унутранай логікі і заканамернасцей шляхам параўнання, суаднесенасці эмпірычных даных з «эталонамі—матрыцамі» або кампаратывісцкімі «аналітычнымі мадэлямі» даследчыкаў.

Як мы пераканаліся ў працэсе даследавання, існуючыя публікацыі не выходзяць за межы тэарэтычнага асэнсавання параўнальных даследаванняў як галіны вывучэння палітыкі. Патрабуюцца работы, прысвечаныя аналізу колькасных і якасных характарыстык палітычных з'яў і працэсаў у пераходных грамадствах, іх супастаўленню з падобнымі феноменамі розных краін і гістарычных эпох. Запас ведаў, атрыманых навукоўцамі Расіі на аснове параўнальнага падыходу да палітычных інтарэсаў, інстытутаў, адносін, культур, рэжымаў, дзеянняў, пераўтварэнняў, мінімальны, а дакладней — не адпавядае патрэбнасцям грамадства. У Беларусі такіх напрацовак практычна няма. Метадалагічны інструментарый параўнальнай паліталогіі выкарыстоўваецца даследчыкамі нясмела і малапрадуктыўна, хаця яны аперыруюць багатым эмпірычным матэрыялам аб сацыяльна-палітычных зменах у пераходных грамадствах.

Цяжка пераацаніць значэнне для цяперашняга этапа грамадскай трасфармацыі ў Беларусі і Расіі палітычнай псіхалогіі, палітычнай сацыялогіі. Іх тэарэтыка-прагматычны патэнцыял за мінулае пятнаццацігоддзе значна ўмацаваўся. Яны ператварыліся ў самадастатковыя, прафесіянальныя галіны ведаў у структуры паліталогіі, вынікі якіх шырока выкарыстоўваюцца ў сацыяльнай практыцы.

Выклікае прафесійную цікавасць літаратура і па такіх раздзелах паліталогіі, як палітычная філасофія [8], палітычная антрапалогія [9], палітычная этыка [10], палітычная лінгвістыка [11], геапалітыка [12], палітычная геаграфія [13] і інш. Іх удзельная вага ў масіве выданняў — сведчанне недастатковай вывучанасці прадмета і структуры паліталогіі як інтэграванай навукі аб палітыцы, «граней» яе спалучальнасці (узаемасувязей і «ліній водападзелу») з гісторыяй, філасофіяй, сацыялогіяй, усім цыклам сацыяльна-гуманітарных дысцыплін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прыведзеныя факты дазваляюць зрабіць вывад аб стане палітычных ведаў у пераходных грамадствах: нягледзячы на непрацягласць перыяду адаптацыі да сацыяльных запатрабаванняў, палітычная навука Расіі і Беларусі паступова сцвярджаецца як аўтаномная, самадастатковая прафесійна-абгрунтаваная галіна грамадазнаўства, назапашвае рэсурсы для дынамічнага развіцця ў будучым.

Айчынная паліталогія паступова пераадольвае заканамерныя «хваробы росту», усё больш упэўнена ўпісваецца ў сусветную палітычную навуку, хаця яе вынікі яшчэ і не заваявалі аўтарытэт на нацыянальнай і міжнароднай палітычнай прасторы. Як выявіла наша даследаванне, у цэлым яна развіваецца ў рэчышчы еўрапейскіх дэмакратычных традыцый, арганічна спалучае ў сабе фундаментальныя і прыкладныя распрацоўкі, у якіх аб'ектыўна зацікаўлены рэфармуемае грамадства і дзяржава.

*Літаратура*


1. XXVIII Всемирный конгресс Международной ассоциации политической науки // Полис. 2000. № 6; *Замалев А. Ф., Осипов Д. И.* Русская политология: обзор основных направлений. — СПб., 1994; *Ильин М. В.* Отечественная политология: осмысление традиции // Политическая наука. 2001. № 1; *Казанцев А. А.* Политическая наука: проблема методологической рефлексии. Обзор круглого стола // Полис. 2001. № 6; Обсуждение проблем и достижений отечественной и мировой политической науки // Полис. 1999. № 6; *Пляйс Я. А.* Творческий потенциал российского политологического сообщества: основные направления исследований // Полис. 1999. № 6; Состояние и перспективы развития политологии в России. Опрос журнала «Полис» среди политологов: первые ответы // Полис. 2000. № 1.
2. *Данилов А. Н.* Переходное общество: проблемы системной трансформации. Мн., 1997.
3. *Василевич Г. А.* Референдумы в Беларуси и ее путь к независимости в конце XX столетия. Мн., 2001; *Он же.* Избирательная система. Референдум. Органы государственной власти: науч.-практ. коммент. Конституции Республики Беларусь. Мн., 2000; *Он же.* Конституционное право Республики Беларусь. Мн., 2002.
4. Беларусь: динамика и приоритеты общественного развития. Мн., 2003; Выборы — 2003: социологический анализ. Мн., 2003; Динамика социальных процессов Республики Беларусь за 10 лет (1990—1999). Мн., 2001; Динамика общественного мнения о социально-политической ситуации в Беларуси / ИСПИ. Мн., 2003.
5. Государственное управление: опыт, проблемы, пути решения. Мн., 1999; Государственное управление: политика в действии. Мн., 2000; Практика государственного управления: проблемы и опыт регионов. Мн., 2000; Руководитель на рубеже XXI века : материалы Междунар. науч.-практ. конф. (22—23 сент. 1999 г.). Мн., 1999. Ч. 2.
6. *Бондарь Ю. П.* Политическая культура как социально-психологический феномен // Психологический журнал. 2005. № 3; *Он же.* Идеология белорусского государства в механизме социального управления: концептуальные подходы // Управление в социальных и экономических системах : материалы XII Междунар. науч.-практ. конф. г. Минск, 5 дек. 2004 г. Мн., 2004. С. 320—322.
7. *Сморгунов Л. В.* Современная сравнительная политология. М., 2002; *Ильин М. В.* Основные методологические проблемы сравнительной политологии // Полис. 2001. № 6; *Он же.* Сравнительная политология: научная компаративистика в системе политического знания // Полис. 2001. № 4; *Митрохина Т. Н.* Сравнение как средство развития политической теории // Полис. 2004. № 3.
8. *Гуторов В. А.* Философия политики на рубеже тысячелетий: судьба классической традиции // Полис. 2001. № 1; *Демидов А. И.* Учение о политике: философские основания. М., 2001; *Поздняков Э. А.* Философия политики. М., 1995; *Сморгунова В. Ю.* Феномен политического знания. СПб., 1996; Философия политики. Кн. 1. Теоретико-методологические проблемы изучения политики / под ред. В. В.Ильина. М., 1994; Философия политики. В 5 кн. / рук. авт. кол. Б. Н. Бессонов. М., 1993; Философия власти / под ред. В. В. Ильина. М., 1993 и др.
9. *Ильин В. В., Панарин А. С., Бадовский Д. В.* Политическая антропология. М., 1995; Абдулатипов Р. Г. Этнополитология. СПб., 2004.
10. *Костюк К. Н.* Политическая мораль и политическая этика в России // Социально-гуманитарные знания. 1999. № 5; Политическая и экономическая этика / пер. с нем. С. Курбатовой, К. Костюка. М., 2001.
11. *Соколова О. Е.* Политическая лингвистика // Полис. 2004. № 4.
12. *Гаджиев К. С.* Геополитика. М., 1997; Поздняков Э.А. Геополитика: теория и практика. М., 1993; *Цымбурский В. Л.* Геополитика как мировидение и род занятий // Полис. 1999. № 4; *Чешков М. А.* Глобалистика: предмет, проблемы и перспективы // Общественные науки и современность. 1998. № 2.
13. *Туровский Р. Ф.* Политическая география. Смоленск, 1999.


*Summary*

*The article presents the comparative analysis of the scientific research in politics in Belarus and Russia. The main directions of studying the transformational process are described and critically evaluated. The author shows that the national political studies are overcoming step by step the problems of growth and have in their disposal the theoretical and practical research publications which the society in transformation is interested in.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ